# НЕКАТОРЫЯ АСПЕКТЫ ВЫКЛАДАННЯ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ Ў ПАЧАТКОВЫХ КЛАСАХ

Даркові Святлана Іванаўна
УА «Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А.С. Пушкіна

У апошнія дзесяцігоддзі метадысты ўсё больш сталі гаварыць аб тым, што граматыка-правапісная накіраванасць у навучанні беларускай мовы не толькі робіць урокі сумнымі і малаэфектыўнымі, але і не забяспечвае засваенне мовы як сродку зносінаў, інструмента практычнай дзейнасці. У падручніках новага пакалення сталі больш увагі ўдзяляць праблемам развіцця маўлення. Аднак валоданне мовай прадугледжвае не столькі веданне правілаў, колькі валоданне камунікатыўнымі якасцямі маўлення, пабудова тэксту адпаведна з камунікатыўнымі мэтамі і ўмовамі зносінаў. У сваю чаргу фарміраванне такіх уменняў магчыма толькі пры ўмове спасціжэння законаў адпаведнасці тэксту. Калі раней мова мастацкага твора разглядалася толькі пры вывучэнні твораў мастацкай літаратуры, то сёння ўсё больш заданняў падобнага тыпу ўключаюцца ў падручнікі беларускай мовы. Гэта адзін з самых цікавых і самых цяжкіх аспектаў працы з тэкстам, так як патрабуе ўважлівых адносінаў да слова.

Трэба адзначыць, што на сучасным этапе навучання мовам (беларускай і рускай) тэкст становіцца цэнтральнай адзінкай мовы (маўлення). У пачатковых класах вучань павінен навучыцца не толькі чытаць, лічыць і пісаць, яму неабходна прывіць дзве групы новых уменняў. Да першай адносіцца група ўніверсальных вучэбных дзеянняў, якія складаюць аснову ўмення вучыцца: навыкі вырашэння творчых задач і навыкі пошуку, аналізу інфармацыі. Да другой – фарміраванне ў вучняў матывацыі да навучання, дапамогі ім у самарэалізацыі і самаразвіцці. У адпаведнасці з патрабаваннямі новага стандарта настаўніку неабходна засвоіць сучасную тэхніку і адукацыйныя тэхналогіі, умець выбраць ВМК, выкарыстоўваць магчымасці матэрыяльна-тэхнічнай базы, навучыцца распрацоўваць і рэалізоўваць вучэбныя праграмы. Мэтай навучання на сучасным этапе з’яўляецца не прадметны, а асабісты вынік. Можна абазначыць асноўныя патрабаванні да вынікаў навучання школьніка: 1) асобасныя (гатоўнасць і здольнасць да самаразвіцця), сфарміраванасць матывацыі да навучання і пазнання, вартасна-сэнсавыя ўстаноўкі асобаснай пазіцыі вучняў, сацыяльныя кампетэнцыі і інш.); 2) метапрадметныя (умею вучыцца); 3) прадметныя уменні. Важнае месца ў навучанні адводзіцца прынцыпу, які дае магчымасць выбіраць і канструяваць педагагічны працэс па любой мадэлі, уключаючы і аўтарскія. Пры гэтым важна арганізацыя свайго роду дыялогу разнастайных педагагічных сістэм і тэхналогій навучання, апрабіраванне на практыцы новых формаў. Навучанне ў пачатковых класах трэба пачынаць з таго, каб матываваць вучняў. Рашаючую ролю ў абуджэнні матывацыі да ўрокаў мовы

адыгрывае прадуманы адбор дыдактычнага матэрыялу і сістэма маўленчых заданняў, арыентаваных на выхаваўча-камунікатыўны вынік. У першую чаргу, гэта пастаянная праца над узбагачэннем і ўдакладненнем слоўнікавага запасу вучняў. Слоўнікавая работа можа праводзіца на любым этапе ўрока (тлумачэнне значэння слова, этымалогія слова, слоўнікава-граматычная работа, падбор сінонімаў і антонімаў, г.зн. паўсядзённая лексіка-семантычная, граматычная, арфаграфічная, і словаўтваральная работа). Па-другое, гэта практыкаванні для развіцця артыкуляцыйна-акустычнай базы, што стымулюе пазнавальную актыўнасць вучняў, развівае навык успрымання беларускай мовы (маўлення) на слых, дапамагае палепшыць вымаўленне і выпрацаваць навыкі беглага прагаворвання словазлучэнняў і сказаў, аблягчае запамінанне лексіка-граматычнага матэрыялу. Вельмі важна выкарыстанне на ўроках правілаў-інструкцый (алгарытмаў), якія тлумачаць вучням заканамернасці беларускай мовы, паколькі школьнікам цяжка ўтрымаць у памяці некалькі дзеянняў, якія трэба выконваць у пэўнай паслядоўнасці. Настаўніку неабходна памятаць, што вучні пачатковых класаў лепш засвойваюць лексічныя і граматычныя з’явы, калі праца па іх засваенні суправаджаецца кінестэтычнымі адчуваннямі (пабачыць штосьці канкрэтнае, адчуць, пачуць, патрымаць у руках). Без прадуманай і падрыхтаванай настаўнікам нагляднасці на ўроку абысціся вельмі цяжка. Гэта і натуральная, і прадметная нагляднасць, выкарыстанне інтэрнэт-рэсурсаў і інтэрактыўных дошак і інш. Структура сучасных урокаў павінна быць дынамічный, з выкарыстаннем набору разнастайных аперацый, аб’яднаных у мэтазгодную дзейнасць. Вельмі істотна, каб настаўнік падтрымліваў ініцыятыву вучня ў патрэбным накірунку і забяспечваў прыярытэт яго дзейнасці па адносінах да сваёй уласнай.